Весці БДПУ. Серыя 2. 2019. № 2. С. 69–74

УДК [94(476):630]"177/138"

# ЛЕСААХОЎНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ РАСІЙСКАГА ЎРАДА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА 70-х гг. XVIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА 30-х гг. XIX ст.)

**І. В. Пугач,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 26.03.19.

UDC [94(476):630]"177/138"

# FOREST PROTECTING MEASURES OF THE RUSSIAN GOVERNMENT IN THE TERRITORY OF BELARUS (THE SECOND HALF OF THE XVIII – THE FIRST HALF OF THE 30S OF THE XIX CENTURY)

**I. Pugach,**
*Post-Graduate Student of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 26.03.19.

Артыкул прысвечаны пытанню рэалізацыі лесаахоўных мерапрыемстваў палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў перыяд з другой паловы 70-х гг. XVIII па першую палову 30-х гг. XIX ст. Паказаны працэс развіцця арганізацыйнай структуры і адлюстраваны функцыянальныя абавязкі мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі. Робіцца высновa аб паспяховасці захадаў урада Расійскай імперыі па стварэнні ўмоў для ажыццяўлення эфектыўнай лесаахоўнай палітыкі ў краі.

*Ключавыя словы:* беларускія губерні, урад, лесаахоўная палітыка, мясцовая лесаахоўная адміністрацыя, лясная варта.

The article is devoted to the issue of implementation of the forest protection policy of the Russian government in the territory of Belarus in the period from the second half of the 70s of the XVIII to the first half of the 30s of the XIX century. The process of development of the organizational structure is shown and the functional responsibilities of the local forest protection administration are reflected. The conclusion is made about the success of the measures of the Government of the Russian Empire to create conditions for the implementation of effective forest protection policy in the region.

*Keywords:* Belarusian provinces, government, forest protection policy, local forest protection administration, forest guard.

У канцы XVIII – 30-х гг. XIX ст. у сувязі з далучэннем беларускіх зямель да Расійскай імперыі паводле падзелаў Рэчы Паспалітай сацыяльна-эканамічнае развіццё краю было апасродкавана кантэкстам яго інтэграцыі ў гаспадарчую сістэму Расіі. У адзначаны перыяд імперыя перажывала шэраг пераўтварэнняў, у прыватнасці гаспадарча-адміністрацыйнага характару. Дадзеныя працэсы абумовілі трансфармацыю і сістэмы аховы лясоў на тэрыторыі беларускіх губерняў.

Доўгі час у Расійскай імперыі дзяржаўны лес успрымаўся, галоўным чынам, як крыніца рэсурсаў для флота. Таму першачарговая ўвага надавалася арганізацыі нагляду за карабельным лесам. З 24 жніўня 1765 г. галоўнае кіраванне карабельнымі лясамі на цэнтральным узроўні ўскладалася на экспедыцыю генерал-інтэнданта, якая ўваходзіла ў склад Адміралцейств-калегіі [1]. Аднак у 1780-я гг. ва ўрадавай палітыцы ярка праявілася імкненне да папаўнення дзяржаўнай казны, дзякуючы даходам ад лесу. Так, указам ад 16 лютага 1782 г. усе лясы, уключаючы тыя, што падлягалі нагляду з боку Адміралцейств-калегіі, былі падначалены дырэктарам дзяржаўных эканомій [2]. Трэба адзначыць, што такая сістэма кіравання не мела магчымасці цалкам сканцэнтравацца на арганізацыі эфектыўнай аховы лясоў, бо акрамя гэтага адзначаныя асобы выконвалі шэраг іншых гаспадарчых функцый. З 31 сакавіка 1797 г. нагляд за дзяржаўнымі лясамі ўскладаўся на Экспедыцыю дзяржаўнай гаспадаркі, апякунства іншаземных і сельскага дамаводства. У сувязі з гэтым пры ёй павінны былі знаходзіцца спецыяльныя лясныя служboўцы – вальдмейстары [3].

Рэпазіторый БДПУ

26 мая 1798 г. лясная частка ў Расійскай імперыі была падначалена Адміралцейств-калегіі, у складзе якой быў заснаваны спецыяльны дэпартамент па лясной частцы [4]. У сувязі з утварэннем міністэрстваў 8 верасня 1802 г. было заснавана Міністэрства фінансаў, якому быў падначалены Лясны дэпартамент. Згодна з «Проектом устава о лесах», зацверджаным Аляксандрам I 11 лістапада 1802 г., усе лясы, за выключэннем тых, якія складалі прыватную ўласнасць, павінны былі знаходзіцца ў кіраванні Ляснога дэпартамента. Яго функцыі зводзіліся да арганізацыі збору звестак аб казённых лясах, каардынацыі іх аховы, развядзення новых лясоў, забеспячэння атрымання прыбыткаў з казённых лясоў, адкрыцця спецыяльных лясных навучальных устаноў, кіраўніцтва, сумесна з казённымі палатамі, надзяленнем дзяржаўных сялян участкамі лесу [5; 6].

Згодна з «Общим учреждением Министерств» ад 25 чэрвеня 1811 г. Міністэрства фінансаў вызначалася як структура, якая займаецца кантролем усіх крыніц дзяржаўных прыбыткаў, у тым ліку і дзяржаўных лясоў [7]. 25 ліпеня 1811 г. было выдадзена «Учреждение Министерства финансов», згодна з якім адзначанае міністэрства падзялялася на 4 дэпартаменты і канцылярыю міністра. Адным з іх стаў Дэпартамент дзяржаўных маёмасцей. Ён падзяляўся на 5 аддзяленняў, сярод якіх былі аддзяленне карабельных лясоў і аддзяленне казённых лясоў. Да прадметаў дзейнасці першага адносіліся вылучэнне карабельных лясоў з астатніх казённых лясоў, забеспячэннеляснымі матэрыяламі адміралцействаў, флоту, партоў і верфяў, а таксама ваенных патрэб. Аддзяленне казённых лясоў займалася арганізацыяй кантролю за ўсімі казённымі лясамі (акрамя карабельных, удзельных і адведзеных горным заводам і фабрыкам), іх падзелам па прадмеце ўжывання, водпускам лесаматэрыялаў у казённыя месцы на розныя патрэбы і каардынацыяй дзейнасці лясных навучальных устаноў [8; 9, с. 85–88; 10]. Канчаткова функцыі па кіраванні лясамі перайшлі да Дэпартамента дзяржаўных маёмасцей 31 снежня 1811 г. [11]. На працягу 1811–1837 гг., кантроль стану лясной справы замацаваўся за Міністэрствам фінансаў і яго Дэпартаментам дзяржаўных маёмасцей.

Разам з пераўтварэннямі цэнтральных органаў кіравання трансфармавалася і мясцовая адміністрацыя. Пэўны час, пачынаючы з выдання «Учреждений для управления губерний Всероссийской империи», нагляд за лясамі ажыццяўлялі казённыя палаты, а дакладней дырэктары дамаводства [12]. У сваю чаргу губернатары павінны былі сачыць за выкананнем усіх пастаноў, якія адносіліся да ляснога кіравання. Як ужо ўзгадвалася раней, у 1782 г. усе лясы, якія былі падведамасны Адміралцейств-калегіі, былі перададзены пад юрысдыкцыю казённых палат. 12 сакавіка 1798 г. было прынята рашэнне аб увядзенні пасадаў спецыяльных чыноўнікаў, якія б займаліся выключна лясной часткай. Імі сталі обер-фарштмейстары і фарштмейстары ў далейшым падначаленыя Ляснному дэпартаменту, а затым і Дэпартаменту дзяржаўных маёмасцей. Обер-фарштмейстары былі адначасова падпарадкаваны Адміралцейств-калегіі і губернатарам. Яны павінны былі захоўваць і разводзіць лясы, здымаць іх на карты і планы, даносіць пра парушэнні ляснога заканадаўства губернатарам для прыняцця адпаведных захадаў і г. д. Акрамя таго, обер-фарштмейстары арганізоўвалі працэс нарыхтоўкі драўніны для дзяржаўных патрэб і выказвалі свае меркаванні наконт павелічэння прыбыткаў казны за кошт аптымізацыі вядзення лясной гаспадаркі. Для вырашэння задач па ахове лясоў на лакальным узроўні пад кіраўніцтвам обер-фарштмейстараў прызначаліся фарштмейстары [9, с. 60–62; 13]. Пад кіраўніцтвам апошніх, на ўзроўні лясных дыстанцый і ўчасткаў, за арганізацыю аховы лясоў адказвалі ферштары і ўнтэр-ферштары. Для распаўсюджвання лесазнаўства за кожным з фарштмейстараў было прынята рашэнне замацаваць па два вучні. Трэба адзначыць, што палажэнні фарштмейстарскай інструкцыі захоўвалі сваю моц да канца 1830-х гг. [9, с. 59]. Прынцыповай асаблівасцю такога падыходу да фарміравання мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі было тое, што да абавязкаў лясных чыноўнікаў адгэтуль адносілася не толькі ахова лясоў, але і іх развядзенне. Указам ад 18 сакавіка 1799 г. обер-фарштмейстарам было дазволена даносіць напрамую да Ляснога дэпартамента пра неабходныя пастанаўленні па лясной частцы, не чакаючы распараджэння губернатараў. Дадзенае рашэнне прывяло да канфлікту паміж ляснымі чыноўнікамі і іншымі губернскімі чыноўнікамі з-за даволі цеснай сувязі лясной часткі з сельскай гаспадаркай. У выніку Лясны дэпартамент быў вымушаны займацца разглядам спрэчных сітуацый замест канцэнтрацыі ўвагі на ахове лясоў. Акрамя таго, губернатары адгэтуль не лічылі, што павінны кантраляваць дзейнасць обер-фарштмейстараў. Гэта прывяло да

Рэпазіторый БДПУ

ўскладнення выкрыцця злачынстваў з боку лясных чыноўнікаў. Для выпраўлення гэтай сітуацыі 16 чэрвеня 1803 г. обер-фарштмейстары былі зноў падначалены губернатарам. Трэба адзначыць, што першапачаткова рэфармаванне лясной часткі на тэрыторыі Беларусі ажыццяўлялася не ў поўным аб'ёме. Гэта было звязана з недахопам звестак пра мясцовыя лясы. Для іх апісання ў беларускія губерні былі накіраваны обер-фарштмейстары з неабходнай колькасцю землямераў. Толькі пасля таго, як была атрымана неабходная інфармацыя, лясныя чыноўнікі новага ўзору пачалі сваю работу па наглядзе за беларускімі лясамі [9, с. 56, 59–60, 78–80; 14; 15, с. 217–226].

Своеасаблівым захадам для папярэджання і выкрыцця лясных злачынстваў стала паступовае ўтварэнне лясных застаў, якія ажыццяўлялі кантроль за сплавам лесу па рэках. Аднак у 1818 г. большасць застаў спынілі сваё існаванне з-за таго, што іх дзейнасць перашкаджала суднаходству. Сваю дзейнасць працягнулі толькі Рыбінская, Шлісэльбургская і Архангельская заставы [15, с. 368].

19 чэрвеня 1826 г. быў выдадзены ўказ аб новым уладкаванні лясной справы. Обер-фарштмейстары былі перайменаваны ў губернскіх ляснічых і ўзначалілі ўтвораныя пры казённых палатах лясныя аддзяленні. Перайменаванню падлягалі і астатнія лясныя чыноўнікі. Так, фарштмейстары атрымалі назву акруговых ляснічых, фарштмейстарскія вучні – памочнікаў акруговых ляснічых, ферштары – малодшых ляснічых, унтэр-ферштары – падляснічых. Звыш грашовых акладаў лясныя чыноўнікі атрымлівалі зямельныя надзелы наступных памераў: акруговыя ляснічыя – ад 30 да 60 дзес., малодшыя – ад 20 да 40 дзес., падляснічыя – ад 15 да 30 дзес. Трэба адзначыць, што функцыянал адзначаных чыноўнікаў не зведаў істотных змяненняў. Згодна з гэтым палажэннем лясы, падведамасныя органам дзяржаўнага кіравання, падзяляліся на акругі. У сваю чаргу, акругі падзяляліся на лясніцтвы і лясныя ўчасткі. Фактычна рэфармаванне лясной часткі пачалося толькі восенню 1827 г., калі адзначанае палажэнне было апублікавана [16].

З пачатку XIX ст. да рэфармавання лясной часткі арганізацыю лесаахоўнай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ажыццяўлялі больш за 150 чыноўнікаў. Абапіраючыся на звесткі, якія ўтрымліваюць фармулярныя спісы, толькі каля 13 % з іх мелі спецыяльную лясную адукацыю. Гэта магло стаць следствам прынятага 14 красавіка 1803 г. рашэння аб прызначэнні лясных чыноўнікаў без правядзення адпаведнага экзамену у сувязі з неразвітасцю ў Расійскай імперыі сістэмы лясной адукацыі [17]. Трэба адзначыць, што да канца разглядаемага перыяду гэты паказальнік не меў істотных ваганняў. Разам з тым, вялікая колькасць лясных чыноўнікаў несла ваенную службу ці ўдзельнічала ў ваенных паходах на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай супраць французскіх войскаў падчас вайны 1812 г. і г. д., чым паказвала сваю лаяльнасць да расійскага ўрада. Гэта акалічнасць дае падставу меркаваць, што адным з галоўных крытэрыяў пры камплектаванні штату лясных чыноўнікаў была дабранадзейнасць кандыдатаў, а не ўзровень адукацыі. Паводле паходжання, большасць лясных чыноўнікаў адносілася да вышэйшага саслоўя – каля 84,5 %. Найбольшая ўдзельная вага дваранства была характэрна для пасады обер-фарштмейстараў – 100 %. Адпаведны паказальнік для фарштмейстараў складаў каля 76,2 %, ферштараў – каля 88,2 %, фарштмейстарскіх вучняў – каля 88,1 %. На астатнія саслоўі (выхадцы з афіцэрскіх сем'яў, духоўныя асобы, гараджане і інш.) прыпадала каля 15,5 %. Сярэдні ўзрост мясцовых лясных чыноўнікаў складаў каля 38 гадоў. Для обер-фарштмейстараў гэты паказальнік знаходзіўся на адзнацы ў 49,6 гадоў, фарштмейстараў – 36,7 гадоў, ферштараў – 33,9 гадоў, фарштмейстарскіх вучняў – 28,9 гадоў. Каля 49 % усіх лясных чыноўнікаў на тэрыторыі Беларусі былі жанатымі, каля 48 % – халастымі, каля 3 % – удаўцамі. Абапіраючыся на змест фармулярных спісаў лясных чыноўнікаў беларускіх губерняў, можна меркаваць, што праз 10 гадоў пасля выдання палажэння ад 19 чэрвеня 1826 г. тэндэнцыі ў кадравым камплектаванні не зведалі істотных змяненняў. У 1835–1836 гг. службу на тэрыторыі Беларусі несла каля 70 лясных чыноўнікаў. Паказальнік сярэдняга ўзросту некалькі павялічыўся і склаў каля 43 гадоў. Па-ранейшаму дваранства было найбольш прадстаўленым саслоўем – болей 86 %. У канфесійным разрэзе сярод мясцовых чыноўнікаў пераважалі асобы каталіцкага веравызнання (57,6 %), другое месца належала праваслаўным (24,2 %). Найменш прадстаўлены былі прыхільнікі евангелічнага хрысціянства і ісламу (6,1 % і 1,5 % адпаведна). Трэба адзначыць, што канфесійную прыналежнасць 10,6 % лясных чыноўнікаў вызначыць не ўдалося. Пэўным чынам змяніліся паказальнікі, якія характарызуюць сямейнае становішча лясных чыноўнікаў. Так, 63,6 % з іх знаходзіліся ў шлюбе, 27,2 % былі халастымі, а 7,6 % –

Рэпазіторый БДПУ

удаўцамі (дакладная інфармацыя пра 1,6 % чыноўнікаў не была высветлена) [18, арк. 2 адв.-235; 19, арк. 2 адв.-258; 20, арк. 5 адв.-65, 157 адв.-206; 21, арк. 3 адв.-346; 22, арк. 42 адв.-104, 197 адв.-370; 23, арк. 3 адв.-100; 24, арк. 3 адв.-22, 281 адв.-290; 25, арк. 170 адв.-200; 26, арк. 6 адв.-152, 297 адв-322].

Варта адзначыць, што дзейнасць урада і лясных чыноўнікаў была накіравана і на забеспячэнне функцыянавання лясной варты. На тэрыторыі беларускіх губерняў яна насіла пераважна часовы характар і была прадстаўлена ў асноўным палясоўшчыкамі і пажарнымі старастамі. Палясоўшчыкі абіраліся з дзяржаўных сялян, якія пражывалі ў бліжэйшых да лясоў паселішчах. Тэрмін іх службы складаў адзін год. На працягу гэтага года, пад камандаваннем лясных чыноўнікаў, яны павінны былі ажыццяўляць агляд стану лясоў, а таксама прадухіляць незаконныя высечкі лесу і іншыя парушэнні ляснога заканадаўства. Пажарныя старасты абіраліся на тры гады з дабранадзейных сялян. Асноўная іх дзейнасць была сфакусіравана на папярэджанні лясных пажараў і барацьбе з імі. У адрозненне ад палясоўшчыкаў, якія павінны былі быць расквтараваны пры лясных угоддзях, пажарныя старасты маглі пражываць у сваіх паселішчах. Палажэннем ад 19 чэрвеня 1826 г. было прадпісана забяспечваць, згодна з мясцовымі ўмовамі, пешых вартаўнікоў зямельнымі ўчасткамі ад 1 да 5 дзес. [9, с. 41, 80, 89–90; 15, с. 222; 16; 27, с. 349–351; 28, арк. 2-8 адв., 106 адв.-114].

На тэрыторыі Беларусі арганізацыя дзейнасці лясной варты палягчалася існаваннем падобнага інстытута на папярэднім этапе гістарычнага развіцця. У гады знаходжання Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай падобным функцыяналам валодалі старэйшыя асочнікі (або дзясятнікі) і асочнікі, якія выбіраліся з мясцовага насельніцтва [29, с. X, 13–15, 35–36, 62–64, 83–85, 127–129, 150–152, 163–164, 185–187, 221–222, 231–232]. Адметнай асаблівасцю дадзенага перыяду з'яўлялася частковае захаванне на тэрыторыі беларускіх губерняў лясных пасад, характэрных для Рэчы Паспалітай, у прыватнасці асочнікаў [19, арк. 21-21 адв., 38-44 адв.; 27, с. 347-348; 30, с. 50].

Аднак часовы характар лясной варты, а таксама залежнасць вартаўнікоў ад сялянскай абшчыны абумоўлівалі яе нядольнасць да рэалізацыі эфектыўнага нагляду за лясамі на лакальным узроўні [31, с. 230]. З цягам часу кіраўніцтва Расійскай імперыі перагледзела падыходы да арганізацыі лясной варты. Вызначальны крок у гэтым кірунку быў здзейснены 28 снежня 1832 г., калі было прынята рашэнне аб стварэнні пастаяннай лясной варты. Яна фарміравалася з сямейных дзяржаўных сялян і сямейных адстаўных ваенных ніжэйшых чыноў. За сем'ямі пастаяннай лясной варты і аб'ездчыкамі замацоўваліся абыходы і аб'езды. Тэрмін іх службы павінен быў складаць не менш за 20 гадоў, аднак, па стане здароўя або неадпаведнасці патрабаванням, яны маглі пазбавіцца пасады датэрмінова. Прадстаўнікі пастаяннай лясной варты вызваляліся ад выплаты падаткаў і выканання іншых павіннасцей. У адзначаны перыяд прызначэнне сямействаў у пастаянную лясную варту ўскладалася на лясныя аддзяленні казённых палат. Пры ўстанаўленні лясной варты мясцовыя органы кіравання павінны былі аддаваць перавагу тым сем'ям, у якіх хаця б адзін член быў пісьменным. Для пасялення сем'яў лясной варты, якія складаліся з сялян, з казны вылучалася па 100 руб. На пасяленне сямействаў з адстаўных ваенных ніжэйшых чыноў вылучалася па 200 руб. Вартаўнікам адводзіліся зямельныя ўчасткі ад 12 да 40 дзес. у залежнасці ад мясцовых умоў. Заробак пастаяннай лясной варты складаў 15 руб. у год. Забеспячэнне абмундзіраваннем і конямі вартаўнікоў ускладалася на губернскіх альбо старэйшых ляснічых. Да абавязкаў сямействаў пастаяннай лясной варты адносіліся ахова лясоў ад пажараў, самавольных высечак і незаконных захопаў з боку прыватных асоб, недапушчэнне пасьбы жывёлы, збор насення, сеянне і клеймаванне дрэў і г. д. Аб'ездчыкі павінны былі ажыццяўляць нагляд за лясамі, якія адносіліся да даручаных ім аб'ездаў і сачыць за тым, каб кожнае сямейства лясных вартаўнікоў было забяспечана неабходным абмундзіраваннем і спраўна выконвала свае абавязкі [32; 33, арк. 218–222; 34, арк. 8 адв.; 35, арк. 57]. Варта адзначыць, што прызначэнне аб'ездчыкаў у найбольш важныя лясныя дачы прадугледжвалася яшчэ падчас рэфармавання лясной часткі, пачатага ў 1826 г. [31, с. 230; 16]. Згодна з адпаведным палажэннем, яны павінны былі ажыццяўляць нагляд за падначаленымі ім вартаўнікамі, забяспечвацца зямельнымі надзеламі, памеры якіх складалі ад 3 да 8 дзес. Акрамя таго, абапіраючыся на фармулярныя спісы лясных чыноўнікаў па Віленскай губерні, можна зрабіць выснову аб тым, што пасада аб'ездчыка тут была прадстаўлена ўжо ў 1813 г. [21, арк. 73 адв.-76].

З цягам часу, у сувязі з распаўсюджаннем пастаяннай лясной варты, планавалася спы-

Рэпазіторый БДПУ

ніць камплектаванне лясной варты палясоўшчыкамі. Варта звярнуць увагу на тое, што на тэрыторыі Беларусі рэальныя вынікі ў справе замяшчэння часовай лясной варты пастаяннай былі атрыманы толькі ў 1840-х гг. Можна меркаваць, што такі стан рэчаў мог быць абумоўлены парушэннямі мясцовай лесаахоўнай адміністрацыяй правілаў рэфармавання лясной варты [32; 33, арк. 17, 171–172].

Такім чынам, на падставе вышэйпаданага можна казаць аб тым, што ўрадам былі створаны спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі эфектыўнай лесаахоўнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі. На працягу адзначанага перыяду мясцовая сістэма аховы лясоў прайшла значны шлях эвалюцыі, галоўнай асаблівасцю якога з’яўлялася пастаянная тэндэнцыя да павелічэння канцэнтрацыі ўвагі мясцовых органаў кіравання на ахове лясоў. Трэба адзначыць, што аналіз статыстычных звестак і той факт, што ў адзначаны перыяд большасць лясных масіваў знаходзілася ў прыватнай уласнасці, а значыць, і па-за ўвагай лясных чыноўнікаў, даюць падставу ўскласці асноўную адказнасць за скарачэнне лясных плошчаў краю на памеснае дваранства і зрабіць выснову аб адноснай эфектыўнасці мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі ў другой палове 70-х гг. XVIII – першай палове 30-х гг. XIX ст. [36, с. 210; 37, арк. 2 адв.-3; 38, арк. 5 адв.-6; 39, арк. 2 адв.-3; 40, арк. 2 адв.-3; 41, арк. 93–102б].

*Літаратура*


1. Полное собрание законов Российской империи (далее – ПСЗРИ). – 1-е собр. – Т. 17. – Отд. 1. – № 12459. – С. 233–313.
2. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 21. – Отд. 1. – № 15351. – С. 405–406.
3. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 24. – Отд. 1. – № 17897. – С. 519.
4. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 25. – Отд. 1. – № 18534. – С. 255.
5. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 27. – Отд. 1. – № 20406. – С. 243–248.
6. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 27. – Отд. 1. – № 20506. – С. 350–356.
7. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 31. – Отд. 1. – № 24686. – С. 686–719.
8. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 31. – Отд. 1. – № 24688. – С. 728–756.
9. *Врангель, В. В.* История лесного законодательства Российской империи: С присоединением Очерка истории корабельных лесов России / В. В. Врангель. – СПб. : привилегированная типография Фишера, 1841. – [4], 156 с.
10. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 30. – Отд. 1. – № 23020. – С. 226–258.
11. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 31. – Отд. 1. – № 24937. – С. 942.
12. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 20. – Отд. 1. – № 14392. – С. 229–304.
13. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 25. – Отд. 1. – № 18429. – С. 133–159.
14. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 25. – Отд. 1. – № 18895. – С. 590.
15. *Шелгунов, Н. В.* История русского лесного законодательства / Н. В. Шелгунов. – СПб. : типография Министерства гос. имуществ, 1857. – VIII, 378 с.
16. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 1. – Отд. 1. – № 415. – С. 593–610.
17. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 27. – Отд. 1. – № 20712. – С. 541.
18. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у г. Санкт-Пецярбургу (далей – РДГА). – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 85.
19. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 93.
20. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 94.
21. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 110.
22. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 111.


*References*


1. Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii (daley – PSZRI). – 1 ye sobr. – T. 17. – Otd. 1. – № 12459. – S. 233–313.
2. PSZRI. – 1¬-ye sobr. – T. 21. – Otd. 1. – № 15351. – S. 405–406.
3. PSZRI. – 1¬-ye sobr. – T. 24. – Otd. 1. – № 17897. – S. 519.
4. PSZRI. – 1¬-ye sobr. – T. 25. – Otd. 1. – № 18534. – S. 255.
5. PSZRI. – 1-¬ye sobr. – T. 27. – Otd. 1. – № 20406. – S. 243–248.
6. PSZRI. – 1-¬ye sobr. – T. 27. – Otd. 1. – № 20506. – S. 350–356.
7. PSZRI. – 1-¬ye sobr. – T. 31. – Otd. 1. – № 24686. – S. 686–719.
8. PSZRI. – 1-¬ye sobr. – T. 31. – Otd. 1. – № 24688. – S. 728–756.
9. *Vrangel, V. V.* Istoriya lesnogo zakonodatelstva Rossiyskoy imperii: S prisoyedineniyem Ocherka istorii korabelnykh lesov Rossii / V. V. Vrangel. – SPb. : privilegirovannaya tipografiya Fishera, 1841. – [4], 156 s.
10. PSZRI. – 1-ye sobr. – T. 30. – Otd. 1. – № 23020. – S. 226–258.
11. PSZRI. – 1-ye sobr. – T. 31. – Otd. 1. – № 24937. – S. 942.
12. PSZRI. – 1-ye sobr. – T. 20. – Otd. 1. – № 14392. – S. 229–304.
13. PSZRI. – 1-ye sobr. – T. 25. – Otd. 1. – № 18429. – S. 133–159.
14. PSZRI. – 1-ye sobr. – T. 25. – Otd. 1. – № 18895. – S. 590.
15. *Shelgunov, N. V.* Istoriya russkogo lesnogo zakonodatelstva / N. V. Shelgunov. – SPb. : tipografiya Ministerstva gos. imushchestv, 1857. – VIII, 378 s.
16. PSZRI. – 2-ye sobr. – T. 1. – Otd. 1. – № 415. – S. 593–610.
17. PSZRI. – 1-ye sobr. – T. 27. – Otd. 1. – № 20712. – S. 541.
18. Rasiyski dzyarzhauny gistarychny arkhiu u g. Sankt-Petsyarburgu (daley – RDGA). – F. 379. Vop. 8. Spr. 85.
19. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 93.
20. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 94.
21. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 110.
22. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 111.


Рэпазіторый БДПУ

23. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 114.
24. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 115.
25. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 116.
26. РДГА. – Ф. 379. Воп. 8. Спр. 117.
27. Лесной словарь : в 3 ч. / составлен в Департаменте корабельных лесов. – СПб. : привилегированная типография Фишера, 1843–1845. – Ч. 2. – 1844. – [5], 725, VI с.
28. РДГА. – Ф. 387. Воп. 1. Спр. 7059.
29. Ординация королевских пущ в лесничествах бывшего Великого княжества Литовского, составленная по инструкции короля Владислава IV комиссарами Виленским каноником и королевским секретарем Петром Далматом Исайковским и Упитским маршалком Христофором Белозором в 1641-м году / [личный состав комиссии : Я. Ф. Головацкий (председатель) и др. ; предисловие Н. Горбачевского]. – Вильна : Типография Штаба Виленского военного округа, 1871. – XVIII, 325 с.
30. *Карцов, Г.* Беловежская пуща: ее исторический очерк, современное охотничье хозяйство и Высочайшие охоты в Пуще / Г. Карцов. – СПб. : артистическое заведение А. Ф. Маркса, 1903. – XV, 414 с.
31. *Арнольд, Ф. К.* История лесоводства в России, Франции и Германии / Ф. К. Арнольд. – СПб. : Издание А. Ф. Маркса, 1895. – 403, [2] с.
32. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 7. – Отд. 1. – № 5869. – С. 943–956.
33. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ). – Ф. 27. Воп. 1. Спр. 44.
34. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1348.
35. НГАБ. – Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1895.
36. История лесного дела Беларуси / В. П. Тарасенко [и др.] ; Комитет лесного хозяйства Республики Беларусь, Институт леса Национальной академии наук Беларуси, Брянская государственная инженерно-технологическая академия. – 2-е изд. – Гомель : ИЛ, 2004. – 301 с.
37. РДГА. – Ф. 379. Воп. 4. Спр. 2052.
38. РДГА. – Ф. 379. Воп. 4. Спр. 2126.
39. РДГА. – Ф. 379. Воп. 4. Спр. 2128.
40. РДГА. – Ф. 379. Воп. 4. Спр. 2254.
41. РДГА. – Ф. 387. Воп. 1. Спр. 4075.

23. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 114.
24. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 115.
25. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 116.
26. RDGA. – F. 379. Vop. 8. Spr. 117.
27. Lesnoy slovar : v 3 ch. / sostavlen v Departamente korabelnykh lesov. – SPb. : privilegirovannaya tipografiya Fishera, 1843–1845. – Ch. 2. – 1844. – [5], 725, VI c.
28. RDGA. – F. 387. Vop. 1. Spr. 7059.
29. Ordinatsiya korolevskikh pushch v lesnichestvakh byvshego Velikogo knyazhestva Litovskogo, sostavlennaya po instruktsii korolya Vladislava IV komissarami Vilenskim kanonikom i korolevskim sekretarem Petrom Dalmatom Isaykovskim i Upitskim marshalkom Khristoforom Belozorom v 1641¬m godu / [lichnyy sostav komissii : Ya. F. Golovatskiy (predsedatel) i dr. ; predisloviye N. Gorbachevskogo]. – Vilna : Tipografiya Shtaba Vilenskogo voyennogo okruga, 1871. – XVIII, 325 s.
30. *Kartsov, G.* Belovezhskaya pushcha: yeye istoricheskiy ocherk, sovremennoye okhotnichye khozyaystvo i Vysochayshiye okhoty v Pushche / G. Kartsov. – SPb. : artisticheskoye zavedeniye A. F. Marksa, 1903. – XV, 414 c.
31. *Arnold, F. K.* Istoriya lesovodstva v Rossii, Frantsii i Germanii / F. K. Arnold. – SPb. : Izdaniye A. F. Marksa, 1895. – 403, [2] c.
32. PSZRI. – 2¬ye sobr. – T. 7. – Otd. 1. – № 5869. – S. 943–956.
33. Natsyyanalny gistarychny arkhiu Belarusi u g. Minsku (daley – NGAB). – F. 27. Vop. 1. Spr. 44.
34. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1348.
35. NGAB. – F. 2514. Vop. 1. Spr. 1895.
36. Istoriya lesnogo dela Belarusi / V. P. Tarasenko [i dr.] ; Komitet lesnogo khozyaystva Respubliki Belarus, Institut lesa Natsionalnoy akademii nauk Belarusi, Bryanskaya gosudarstvennaya inzhenerno¬tekhnologicheskaya akademiya. – 2¬ye izd. – Gomel : IL, 2004. – 301 s.
37. RDGA. – F. 379. Vop. 4. Spr. 2052.
38. RDGA. – F. 379. Vop. 4. Spr. 2126.
39. RDGA. – F. 379. Vop. 4. Spr. 2128.
40. RDGA. – F. 379. Vop. 4. Spr. 2254.
41. RDGA. – F. 387. Vop. 1. Spr. 4075.


Рэпазіторый БДПУ